ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1980 г.
27 ЛІСТАПАДА
ЧАЦВЕР
№ 32 (1296)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

"Беларускі універсітэт"

## ТЭЛЕТАЙП

• Учора • Сёння • Заўтра •

### НА НАРАДЗЕ

у рэктараце, у якой прынялі ўдзел прадстаўнікі партыйнай, камсамольскай, прафсаюзнай арганізацый, грунтоўна абмеркаваны пытанні па ўмацаванню дысцыпліны і выхаваўчай работы сярод студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта. Звернута ўвага дэканаў факультэтаў, кіраўнікоў іншых структурных падраздзяленняў і грамадскіх арганізацый на далейшае ўдасканаленне ідэйна-палітычнага выхавання.

В. ПЯТРОЎ.

### ЦІКАВА ПРАЙШОЎ

«Вечар паэзіі» ў інтэрнаце № 2. Перад студэнтамі выступіла майстар мастацкага слова Рэгіна Дамброўская. Яна пазнаёміла з новай кампазіцыяй на вершы Пастэрнака, Ляонцьева, Маякоўскага і Сапажкова.

В. МАРОЗ.

### ТАВАРЫСТВА КНІГАЛЮБАЎ

бібліятэкі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна сабрала для школьнікаў Урэнгоя 200 кніг дзіцячай мастацкай літаратуры. Гэта творы рускіх, савецкіх і замежных аўтараў.

Арганізавала збор і адпраўку кніг старшыня пярвічнай арганізацыі таварыства кнігалюбаў бібліятэкі З. Д. Калеснікава.

І. БАРДЗІЯН.

### АДБЫЎСЯ ПЛЕНУМ

таварыства «Веды» універсітэта. Разгледжаны задачы арганізацыі па дастойнай сустрэчы XXVI з'езда КПСС. З дакладам выступіў В. І. Гамаў — старшыня універсітэцкага таварыства «Веды». Вырашана да з'езда партыі прачытаць у працоўных калектывах 14 тысяч лекцый, правесці 20 навуковапрактычных і навукова-тэарэтычных канферэнцый. Плануюцца 25 калектыўных выездаў вучоных на падшэфныя прадпрыемствы. На кожным факультэце будзе прачытаны цыкл лекцый «Ад з'езда да з'езда — ленінскім курсам».

Л. КЛЯУС.

### ПЕРАМОЖЦЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА

спаборніцтва пабывалі ў Таліне. Паездка была арганізавана прафкомам БДУ імя У. І. Леніна. Весела і цікава прайшлі чатыры дні. Студэнты пазнаёміліся са слаўтымі мясцінамі сталіцы Эстоніі, пабывалі ў шматлікіх музеях горада.

М. ІВАНОЎ.

НАСУСТРАЧ XXVI З'ЕЗДУ КПСС

## НА НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ

XXV з'езд КПСС, вызначаючы эканамічную палітыку партыі на дзесятую пяцігодку і доўгатэрміновую перспектыву, зрабіў упор на інтэнсіфікацыю грамадскай вытворчасці, павышэнне эфектыўнасці і якасці працы як важнейшыя састаўныя часткі ўсёй нашай эканамічнай стратэгіі.

У святле гэтых рашэнняў асабліва значэнне набывае дасягненне найвышэйшай эфектыўнасці грамадскай вытворчасці на аснове шырокага выкарыстання прагрэсіўных вынаходніцтваў, крышталізуючых у сабе сапраўды новае ў развіцці навукі і тэхнікі. На іх аснове магчыма больш высокімі тэмпамі інтэнсіфікаваць вытворчасць, павысіць тэхнічны ўзровень прадукцыі і яе якасць, дасягаць перадавых пазіцый у той ці іншай галіне тэхнікі і тэхналогіі. Імення таму вынаходніцтва і рацыяналізацыя з'яўляюцца важнейшым рычагом паскарэння навуковатэхнічнага прагрэсу.

Ва універсітэце за апошнія гады павысіўся ўзровень вынаходніцкай і патэнтна-ліцэнзійнай работы, што характарызуецца павелічэннем колькасці заявак на вынаходніцтвы і станоўчых рашэнняў на выдачу аўтарскіх пасведчанняў. Адносіна колькасці станоўчых рашэнняў да ліку пададзеных заявак павялічылася з 30 працэнтаў у 1976 годзе да 58,9 працэнта ў 1979 годзе.

Найбольшы ўклад у павышэнне рэзультатыўнасці вынаходніцкай і патэнтна-ліцэнзійнай работы ўнеслі кафедры ядзернай фізікі, агульнай фізікі, неарганічнай хіміі, арганічнай хіміі, НДІ ПФП. Павялічылася колькасць вынаходнікаў са 153 у 1976 годзе да 319 у 1979 годзе.

З 1978 года ўведзены абавязковыя перадпланавыя патэнтна-інфармацыйныя даследаванні па ўсіх НДР, у выніку выканання якіх плануецца стварэнне аб'ектаў новай тэхнікі, матэрыялаў, тэхналагічных працэсаў і г. д. З такімі вынікамі мы прыйшлі к цяперашняму часу.

Аднак узровень пастаноўкі і арганізацыі вынаходніцкай і патэнтна-ліцэнзійнай работы яшчэ не адпавядае ў поўнай меры ўзросшым патрабаванням па павышэнню эфектыўнасці і якасці выканання навуковых даследаванняў. Па выніках дзяржаўнай экспертызы значная частка тэхнічных рашэнняў усё яшчэ не прызнаецца вынаходніцтвамі з-за адсутнасці навізны. Гэта гаворыць аб неабходнасці праводзіць больш поўныя патэнтна-інфармацыйныя даследаванні як на стадыі планавання, так і ў працэсе выканання тэм. Патрэбна карэнным чынам палепшыць экспертызу і аналіз заяўляемых вынаходніцтваў на кафедрах, у лабараторыях і на пасяджэннях экспертных камісій. Значная частка навукова-даследчых тэм абаронадольнай тэматыкі заканчваецца без абароны іх вынаходніцтвамі, што гаворыць аб нізкім навукова-тэхнічным узроўні НДР, слабай патэнтна-інфармацыйнай апрацоўцы.

У гэтай сувязі нам неабходна шырока распаўсюдзіць і выкарыстаць пачын інстытута механікі металапалімерных сістэм АН БССР: кожную навукова-тэхнічную распрацоўку — на ўзровень вынаходніцтва. Неабходна дабіцца ўжо пачынаючы з 1981 года, каб усе абароназдольныя тэмы былі абаронены вынаходніцтвамі, што будзе характарызаваць іх высокі навукова-тэхнічны ўзровень.

Э. ДРАБ,
загадчык аддзела вынаходніцкай і патэнтнай работы.

## СВЯТА ПЕРШАКУРСНІКАЎ

НА ХВІЛІНУ патухла святло, і ў вялікай зале, што на шостым паверсе галоўнага корпуса, глашатаі краіны «Гістфакіі» зачыталі каралеўскі ўказ. Твары першакурснікаў узрушаныя — яны прынялі ўрачыстую клятву на вернасць свайму факультэту, які стаў для іх родным домам.

Так пачаўся традыцыйны вечар пасвячэння першакурснікаў у студэнты на нашым факультэце. І як заўсёды, было яно вельмі цікавым, маляўнічым. Галоўнай дзеючай асобай быў герой шматлікіх казак Ямеля. Яго ролю бліскуча выканаў другакурснік Міхаіл Сабураў. Перад вачыма прысутных паўсталі малюнкі студэнцкага жыцця, прычым дзеянне было перанесена на гістарычны час існавання Кіеўскай Русі. Добра ўпісваўся ў агульны настрой прадстаўленні і лірычныя маналогі, у якіх вызначаўся гусляр — студэнт другога курса Аляксандр Гутавец.

Шмат цёплых слоў хочацца сказаць і ў адрас арганізатара гэтага цудоўнага вечара, які ператварыўся ў сапраўднае свята першакурснікаў. І самае галоўнае, што запомніцца яно ім назаўсёды.

А. РЭЗНІК,
студэнт IV курса гістарычнага факультэта.

## ПАГЛЫБЛЕННЕ ПЛЁННАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

### ПАДПІСАНЫ ПЛАН НАВУКОВАГА І КУЛЬТУРНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА ПАМІЖ БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭТАМ імя У. І. ЛЕНІНА І УНІВЕРСІТЭТАМ імя Ф. ШЫЛЕРА Ў ІЕНЕ НА 1981-85 гг.

З КОЖНЫМ ГОДАМ умацоўваюцца навуковыя і культурныя сувязі нашага універсітэта з універсітэтам імя Ф. Шылера. ВНУ сумесна абмяркоўваюць вынікі даследаванняў, дзеляцца вопытам работы ў арганізацыі вучэбнаметадычнага і выхаваўчага працэсаў на факультэтах і кафедрах. Штогод праходзіць абмен студэнцкімі групамі для правядзення азнаямленчай вытворчай практыкі па такіх дысцыплінах, як прыкладная матэматыка, фізіка, філалогія, гісторыя.

Новы пяцігадовы план прадугледжвае далейшае развіццё і паглыбленне плённых кантактаў. Будуць праводзіцца сумесныя даследаванні ў галіне гістарычнага матэрыялізму, прыкладной сацыялогіі, філалогіі, фізічнай оптыкі і інш. Вывучаюцца магчымасці супрацоўніцтва па праблемах хіміі, біялогіі, экалогіі і ахоўы навакольнага асяроддзя, а таксама вылічальнай тэхнікі і матэрыялазнаўства.

Заключэнне доўгатэрміновага дагавору адкрывае шырокія перспектывы для абмену навуковай інфармацыяй і прафесарска-выкладчыцкімі кадрамі, для культурных сувязей.

План навуковага і культурнага супрацоўніцтва на 1981—85 гг. падпісалі рэктар БДУ імя У. І. Леніна акадэмік АН БССР У. А. БЕЛЫ і рэктар Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера прафесар ФРАНЦ БОЛЬК.

Г. БЯЛЬКЕВІЧ.

НА ЗДЫМКУ: у час падпісання плана супрацоўніцтва.
Фота М. Дубовіка.



# ВУЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧАМУ ПРАЦЭСУ — УНІВЕРСІТЭЦКУЮ ГАРАНТЫЮ





## Авалодваюць педагагічным майстэрствам

ЦЯЖКА ДАЦЬ ДОБРЫ ЎРОК у школе вопытнаму педагогу-спецыялісту, не гаворачы ўжо аб студэнтах-практыкантах. Студэнты геаграфічнага факультэта добра падрыхтаваны за час навучання да педагагічнай работы. Аб гэтым сведчаць вынікі педпрактыкі, якую праходзіць адна з груп пятага курса ў сярэдняй школе № 116. Гэта адна з лепшых школ Фрунзенскага раёна горада Мінска.

Нашы студэнты В. Ануфрыева, М. Кастагрызаў, Т. Казакевіч, З. Казлоўская, В. Лешчанка сур'ёзна адносяцца да падрыхтоўкі і правядзення урокаў. У іх заўсёды добра прадуманы кожны крок, пачынаючы ад арганізацыйнага моманту і заканчваючы заданнем на дом і замацаваннем пройдзенага матэрыялу. На іх уроках рэгулярна выкарыстоўваецца дадатковая літаратура, зачытваюцца фрагменты з хрэстаматый па геаграфіі, а ў старэйшых класах — з газет і часопісаў. Напрыклад, вывучаючы ў 8-х класах па эканамічнай геаграфіі СССР тэмы «Лёгкая прамысловасць», «Харчовая прамысловасць», «Геаграфія сельскай гаспадаркі», студэнты выкарыстоўвалі матэрыялы кастрычніцкага (1980 г.) Пленума ЦК КПСС, які прадугледзеў больш паскоранае развіццё гэтых галін.

Урокі нашых студэнтаў атрымліваюцца цікавымі, нестандартнымі з пункту гледжання форм і метадаў вывучэння матэрыялу. Вельмі насычанай сваімі мерапрыемствамі бывае і «Тыдзень геаграфіі». Побач з выпускам насценгазет, арганізацыяй экскурсій, віктарын, гутарак, якія праводзяць самі студэнты, тут рэгулярна выступае перад вучнямі старэйшых класаў загадчык кафедры эканамічнай геаграфіі СССР І. І. Трухан.

Вялікую метадычную дапамогу ў правядзенні ўрокаў і пазакласных мерапрыемстваў аказвае дацэнт кафедры педагогікі З. М. Цітох. Яе добразычлівыя парады і заўвагі ідуць на карысць справе: студэнты больш упэўнена адчуваюць сябе ў ролі педагога, імкнуцца даступна і цікава выкладаць матэрыял.

Пачынаючы з першых урокаў, якія давалі студэнты, Зінаіда Максімаўна падкрэслівала значэнне такіх момантаў, як праблемнасць тэмы, развіццё лагічнага мыслення ў вучняў, актывізацыя работы класа, устанаўленне кантакту з ім, неабходнасць быць строгім і патрабавальным пры ацэнцы ведаў і паводзін.

Задаволены ўрокамі студэнтаў-географаў і настаўнікі школы. І ў гэтым вялікая заслуга нашага «галоўнага метадыста» на факультэце прафесара В. А. Жучкевіча, які чытае курс «Методыка выкладання геаграфіі ў школе». Яго высокая патрабавальнасць да студэнтаў у справе авалодання ведамі і педагагічным майстэрствам географа-педагога, яго слушныя пажаданні не прайшлі дарэмна.

**Н. ЖУРАЎСКАЯ,**
**дацэнт кафедры эканамічнай геаграфіі СССР.**

**НА ЗДЫМКАХ: студэнты М. Кастагрызаў і З. Казлоўская праводзяць урокі; дацэнт кафедры педагогікі З. М. Цітох і выкладчыца геаграфіі СШ № 116 М. М. Пыліла абмяркоўваюць са студэнтамі прайшоўшыя заняткі.**

Фота аўтара.



## ПОСПЕХ — У ДАВЕР'І

**З ВОПЫТУ КУРАТАРА**

**Мы прыходзім на першы курс, нас аб'ядноўваюць у групы, назначаюць куратара. І ад таго, хто стане кіраўніком групы, будзе залежаць калі не ўсё, то ва ўсякім выпадку многае. І ў першую чаргу, ці стане група калектывам. Мы запрасілі адказаць на некалькі пытанняў выкладчыка А. М. Матузко — куратара першай групы 5-га курса геафака.**

**— Аляксандр Мікалаевіч, у тлумачальным слоўніку запісана: «Куратар — асоба, якой даручана кіраўніцтва, нагляд за кімсьці, чым-небудзь». Ці згодны Вы з такім вызначэннем?**

— Мяркую, што слова гэтае не адпавядае сутнасці функцыям куратара. Хіба адлюстроўвае яно ўсю шматграннасць і цікавасць працы са студэнтамі? Тут сэрца ўкладваецца, душа, а не проста абавязак нейкі.

**— Студэнты прэтэндуюць на самастойнасць. Ці так ужо неабходны куратар студэнцкай групе?**

— Глыбока ўпэўнены, што патрэбен. Асабліва на першым — другім курсах. Многія сталі студэнтамі адразу пасля школы, уступаюць у самастойнае жыццё, супярэчлівае і складанае, з безліччу праблем і цяжкасцей. Тут без парады і дапамогі старэйшых таварышаў не абысціся.

**— Чаму часта атрымліваецца так, што група і куратар аб'яднаны толькі фармальна?**

— Магчыма, таму, што некаторыя куратары адносяцца да справы як да даручэння. У выніку — не будзе ўзаемнага разумення паміж групай і кіраўніком, давер'я; не будзе патрэбнага кантакту, не ўзнікнуць тыя сувязі, якія аб'ядноўваюць іх у адно цэлае.

**— Што Вы лічыце каштоўным у сваім вопыце куратара?**

— Ведаеце, гэта ўсё ж не проста быць куратарам. Патрэбна прызванне. Галоўнае — зразумець адзін другога. І тут без індывідуальнай работы не абысціся. Я знаём з бацькамі ўсіх сваіх студэнтаў. Гэта дапамагае больш зразумець групу, кожнага асобна. Трэба баяцца чытаць натацыі, павучаць іх. Асабліва, калі група толькі фарміруецца. Студэнты самі дойдуць да сутнасці. Мая мэта — дапамагчы ім, тонка і ўмела.

Гэта нашы сходкі ў мяне дома за чаем, дыскусіі, абмеркаванні. Збіраемся і ў нашых рабят-мінчан. Не тры-чатыры чалавекі, а ўся група. Так мы правяраем свае сілы, сябе як калектыў.

**— І традыцыйнае. Вашы пажаданні сваім калегам — куратарам.**

— У кожнага куратара шмат іншых клопатаў, але трэба працаваць, працаваць нястомна.

**Інтэрв'ю правёў**
**М. ЛАХВІЧ.**

**● ШЧЫРЫ МАНАЛОГ**

## *Да цяжкасцей — з аптымізмам*

СЕМЕСТР У РАЗГАРЫ. Наперадзе — зімовая сесія. Для мяне і маіх сяброў-аднакурснікаў будучая экзаменацыйная сесія — першая. Наогул усё ў нашым сённяшнім жыцці новае, незнаёмае. Але цікавае.

У першыя дні вучобы на факультэце цяжка было знайсці сваю аўдыторыю, цяжка справіцца з хуткім тэмпам выкладання матэрыялу і, вядома, зусім нялёгка на першых семінарскіх занятках гэтак жа хутка і ўпэўнена адказаць на пастаўленае пытанне.

Паступова жыццё ўваходзіць у патрэбнае рэчышча. Шмат што становіцца простым, зразумелым, нямала яшчэ і нявырашаных пытанняў.

Несумненна, наперадзе розныя справы: простыя, складаныя. Але я лічу, што да цяжкасцей трэба адносіцца з аптымізмам, не здавацца, перамагаць іх.

**В. БАСАЛАЙ.**

**● ПРАКТЫКА**

## Наперадзе цікавыя назіранні

**У СТУДЭНТАЎ IV КУРСА** беларускага аддзялення філалагічнага факультэта пачалася практыка.

Як і заўсёды — першае знаёмства з класам хвалюючае, самае запамінальнае. І «малявалі» мы яго, як кажуць, у ружовых фарбах... «Вось зойдзем у клас — цішыня... Рабяты працуюць... На першае пытанне — лес рук. Настрой пасля ўрока — бадзёры»...

— 10-м класе дысцыпліна не на належным узроўні, але затое вельмі цікава назіраць за паводзінамі вучняў. Кожная хвіліна ўрока — маленькая сцэнка з пачаткам і працягам, часам самым неверагодным. На ўроку ў 10-м класе сядзяць практыканты, настаўніца, метадыст. І раптам — «бац!..» Гэта адна дзяўчын «адпомсціла» свайму суседу па парце. Супакойваю, працягваю тлумачэнне далей. Пасля званка — «больш не буду-у...»

Вельмі падабаецца шосты. Тут сапраўды так, як і ўяўлялася.

Лес рук, адказваюць хутка. Бачна, што рабяты працуюць з задавальненнем, любяць прадмет. У гэтым класе пасля ўрока сапраўды адчуваеш сябе бадзёрым.

Другі тыдзень практыкі. Наперадзе — цікавыя сустрэчы, назіранні, думкі.

Практыка працягваецца...

**Т. СОТЧАНКА,**
**А. ЦІТАВЕЦ,**
**студэнткі філфака.**

# НАСТАЎНІК

ПРАГЛЯДАЮЧЫ НЕЯК «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта», звярнуў увагу на фотаздымак жанчыны. Строгі позірк, выразныя рысы твару характарызавалі энергічнага, мэтанакіраванага чалавека. Прачытаў тэкст і даведаўся, што Надзея Сямёнаўна Мажэйка — кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства, дэкан завочнага факультэта нашага універсітэта.

Рэдакцыйны пакой і рабочы кабінет Надзеі Сямёнаўны — праз сцяну. Усяго некалькі крокаў. Але для таго, каб убачыцца з ёю, што-небудзь удакладніць, мне давялося прастаяць у чарзе студэнтаў не адну гадзіну. Якраз быў дзень завочніка, і будучыя філолагі і хімікі, матэматыкі і юрысты штурмавалі кабінет, што называецца, «штурмавалі» кабінет. Аднаму неабходна ўдакладніць тэму дыпломнай работы, другому — тэрмін здачы залікаў ці экзаменаў, а іншыя (былі і такія) ішлі, каб падзяліцца асабістым.

Мы сядзім у яе кабінеце. Надзея Сямёнаўна раз-пораз паглядае на гадзіннік. Не, не таму, што сёння субота, што працоўны дзень ужо даўно закончыўся. У калідоры прыціхлі завочнікі, якія прыехалі сёння да свайго дэкана з блізкіх і далёкіх вёсак і вёсак, гарадоў і райцэнтраў. Таму на размову Н. С. Мажэйка адвяла некалькі хвілін. І я разумею яе.

Цяжкімі былі яны, тыя першыя пасляваенныя гады. Хлеб — па картачках, цукар — таксама. Ды што там цукар! Надзея Сямёнаўна з усмешкай успамінае, як яны, дзяўчатыстудэнткі, дзяліліся адзінымі туфелькамі-лодачкамі, каб збегаць на танцы ці на спатканне, а пасля цішком плакалі — так смылелі пацёртыя ногі.

Шмат чаго не хапала. Але было галоўнае — прага да ведаў. Гэта яна дапамагала варочаць цяжэрныя каменюкі-глыбы, узводзіць на месцы былых папялішчаў універсітэт. Хто думаў тады, што праз якіх-небудзь дваццаць гадоў ён стане прыгожым і велічным, народжаным з руін і попелу. Не да таго было. Днём працавалі, а з вечара да позняй ночы вывучалі логіку і матэматыку, псіхалогію і мову, літаратуру і гісторыю.

...Яна прыцягнула ўвагу выкладчыкаў не толькі выдатнай вучобай і філалагічнымі здольнасцямі. Удумлівасць, самастойнасць, якую хутчэй можна назваць сталасцю, вылучалі Надзею Мажэйка між сябровак. Ёй прапанавалі працягваць вучобу ў аспірантуры, паглыбляць веды. І вось ужо чвэрць стагоддзя яна працуе ва універсітэце.

Пра Н. С. Мажэйка, пра яе педагагічную і навуковую працу можна гаварыць доўга. Больш дваццаці гадоў яна была куратарам студэнцкіх груп, шмат разоў выбіралася ў састаў прафсаюзнага бюро філфака. Сёння Н. С. Мажэйка — член рэктарата, член савета універсітэта і філалагічнага факультэта, член агульнауніверсітэцкага навукова-метадычнага савета, член спецыялізаванага савета па абароне кандыдацкіх дысертацый... Выконваючы шматлікія грамадскія даручэнні, Надзея Сямёнаўна знаходзіць час для навуковай дзейнасці. Яна — аўтар двух вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў-філолагаў і гісторыкаў, шматлікіх змястоўных публікацый. У апошні час яна разам з загадчыкам кафедры прафесарам А. Я. Супруном складае частотны слоўнік беларускай мовы. Ужо выйшлі з друку два першыя выпускі. Гэта праца атрымала станоўчыя водгукі не толькі ў лінгвістаў нашай краіны, але і за мяжой — у Балгарыі, Чэхаславакіі, Югаславіі.



НА ЗДЫМКУ: Надзея Сямёнаўна Мажэйка ў час работы над частотным слоўнікам беларускай мовы.

Калі я спытаў у Надзеі Сямёнаўны, у чым сэнс жыцця, яна адказала:

— Хутчэй за ўсё ў працы. Так, у працы. Сказаць, што ў мяне прага да педагогікі са школы, значыць, нічога не сказаць. Калі чалавеку не хапае паветра, ён задыхаецца. Так і я. Дастаткова хоць на некалькі дзён адарвацца ад сваёй работы — адчуваю сябе хворай. А з гэтымі юнакамі і дзяўчатамі сама раблюся маладой і бадзёрай. Іменна гэтая сувязь дае той зарад энергіі, што рухае наперад, не дазваляе таптацца на месцы.

Яна раптам нешта ўспамінае і дадае:

— Згадзіцеся, прыемна, калі самастойныя і паважаныя людзі кажуць табе шчырае «дзякуй».

Сапраўды, самая найлепшая ўзнагарода для нас — памяць людская. Яна лёгка развітваецца з нікчэмнасцю і дробязямі, але здольна вельмі доўга берагчы добрае чалавечае імя.

— Надзея Сямёнаўна, — спытаў я, развітваючыся, — ці была ў Вас запаветная мара?

— Запаветная? Была. Жыць і працаваць так, каб цябе называлі Настаўнікам. Так, пішыце слова «настаўнік» з вялікай літары. Памылкі не будзе...

**А. ЛАЗОЎСКІ,**
**наш кар.**

# Святло ленінскай «Искры»

НА ХІМІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ вялікая ўвага ўдзяляецца вывучэнню жыцця і дзейнасці У. І. Леніна, чыё імя носіць наш універсітэт. Спачатку праца вялася ў напрамку збору матэрыялаў аб знаходжанні У. І. Леніна за мяжой, азнаямлення з экспанатамі, якія сабраны ў выніку перапіскі з музеямі тых краін, дзе Ленін быў у эміграцыі.

На аснове матэрыялаў і экспанатаў, атрыманых з Лейпцыга, Берліна, Жэневы, Стакгольма, Лондана, Кракава, была арганізавана выстаўка, прысвечаная 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, якая адлюстравала найбольш важныя моманты ў жыцці правадыра (стэнды, альбомы, калекцыі значкоў, марак, паштовак, дыяпазітываў і г. д.). Затым адбылася канферэнцыя, прысвечаная юбілею Ільіча, на якую прадстаўляліся даклады і рэфераты на нямецкай мове.

У цяперашні час усё прагрэсіўнае чалавецтва рыхтуецца адзначыць 80-годдзе з дня выхаду ў свет першага нумара газеты «Искра». Напярэдадні гэтай падзеі на хімфаку пройдзе канферэнцыя, на якой яшчэ раз будзе падкрэслена роля Леніна ў стварэнні партыі новага тыпу і развіцці міжнароднага рэвалюцыйнага руху. Канферэнцыя будзе арганізавана на аснове матэрыялу, які прысланы з Лейпцыга — горада, адкуль упершыню былі абвешчаны вядомыя словы «Из искры возгорится пламя».

Выхаду ў свет першай агульнарускай газеты папярэднічала вялікая работа. Ленін разумеў, што арганізуючым цэнтрам у стварэнні партыі мог стаць агульнарускі палітычны орган. Ён садзейнічаў бы стварэнню ідэалагічнага адзінства партыі.

Аб гэтым пойдзе размова ў дакладах, якія прадставілі на канферэнцыю студэнты Ю. Грыгор'еў, І. Клюй, В. Курачова, А. Тарасевіч, А. Мірашнічэнка, А. Курнова, А. Пазняк. Да юбілею афармляецца новы стэнд, дзякуючы якому можна пазнаёміцца не толькі з фотакопіяй першага нумара «Искры», але і мемарыялам друкарні «Искры», выглядам самога будынка друкарні, некаторымі прадметамі, якія знаходзіліся тады ў друкарні, — лямпай, сталом, друкарскім станком, наборным станком са шрыфтом, фатаграфіямі таварышаў, якія ўдзельнічалі ў выданні і распаўсюджанні «Искры».

На канферэнцыі будуць гучаць жывое слова Ільіча ў запісах на пласцінцы і яго любімыя музычныя творы.

Другі этап канферэнцыі адкрыецца сустрэчай з ветэранам партыі, равеснікам «Искры» Сяргеем Мікалаевічам Сяргеенкам, генерал-лейтэнантам танкавых войск.

На свята «Искры» будуць запрошаны замежныя студэнты, якія навучаюцца ў нашым універсітэце.

**Л. ВЯНЖЫЦКАЯ,**
**выкладчыца кафедры нямецкай мовы,**
**А. УСОВІЧ,**
**студэнтка IV курса хімфака.**

З НАШАЙ ПОШТЫ

# АКТЫЎНЫ ПАМОЧНІК ПАРТЫІ

У ВЕЛЬМІ ЦЯЖКІХ умовах жыў народ Йемена, калі краіна была англійскай калоніяй. Але ў барацьбе за незалежнасць працоўныя Народнай Дэмакратычнай Рэспублікі Йемен заваявалі свабоду. Актыўны ўдзел у рэвалюцыі прымала йеменская моладзь: арганізоўвала стачкі, абараняла нацыянальныя інтарэсы. 30 лістапада 1967 года рэспубліка атрымала незалежнасць. У той час у краіне было вельмі складанае становішча: слабая эканоміка, панавалі беспрацоўе і няроўнапраўе. Пасля рэвалюцыі быў створаны Саюз йеменскай сацыялістычнай моладзі, які павінен быць актыўным памочнікам і рэзервам партыі, працаваць у цеснай сувязі з масавымі арганізацыямі краіны.

Наша партыя накіроўвае дзейнасць Саюза моладзі, дапамагае арганізоўваць добраахвотныя пачыны ў працы і вучобе, будзіць імкненне да настойлівага авалодання ідэямі навуковага сацыялізму.

Цесныя сувязі існуюць паміж нашым Саюзам моладзі і камсамольскімі арганізацыямі Савецкага Саюза. Ёсць у краіне піянерская арганізацыя, якая таксама мае свае задачы і свае правы.

**Касім УСАЧЫ,**
**студэнт II курса факультэта журналістыкі.**

# УМОВЫ — ЛЕПШЫЯ

У БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА навучаецца шмат замежных грамадзян. Як для савецкіх рабят, так і для нас інтэрнат, у якім мы жывём, стаў своеасаблівым другім домам. Зносіны з хлопцамі і дзяўчатамі з СССР у многім дапамагаюць нам лепш ведаць і разумець рускую мову, хутчэй авалодаць грамадскімі навукамі, спецыяльнымі прадметамі, мацуюць дружбу паміж намі. Мы павінны як мага лепш займацца, бо на радзіму трэба вярнуцца высокакваліфікаванымі спецыялістамі.

Клопат Савецкай дзяржавы аб нас адчуваецца ў многім. Для заняткаў прадастаўлены светлыя аўдыторыі, вучаць нас кваліфікаваныя выкладчыкі. Умовы для атрымання адукацыі — самыя лепшыя.

**Саід МАМАРЫ,**
**студэнт II курса факультэта журналістыкі.**

# КАБ ЖЫЦЦЁ БЫЛО ЦІКАВЫМ

ВЯЛІКУЮ РОЛЮ Ў ЖЫЦЦІ замежных студэнтаў адыгрываюць зямляцтвы. Наша зямляцтва арганізуе прыём нігерыйскіх студэнтаў, якія прыязджаюць у Мінск для вучобы, клапоціцца аб уладкаванні іх быту.

Мы, студэнты, дапамагаем нашым землякам, бо яны яшчэ дрэнна ведаюць рускую мову. Арганізуем мерапрыемствы, наладжваем кантакты з савецкімі арганізацыямі. Зямляцтва вядзе вялікую выхаваўчую работу.

Кожны месяц праходзяць сходы зямляцтва, на якіх падводзяцца вынікі работы і вучобы. Нігерыйскае зямляцтва — дружны калектыў, і дзякуючы яго дзейнасці наша жыццё становіцца ўсё больш цікавым і насычаным.

**А. КУК,**
**А. КАФІ,**
**студэнты II курса факультэта журналістыкі.**

# ШКОЛА ПАСЛЯ ШКОЛЫ

ЯК РОБІЦЦА ГАЗЕТА? Што такое замалёўка, нарыс ці фельетон? І наогул, як навучыцца добра пісаць? Пытанні, пытанні, пытанні... Яны задавалі іх шмат, бо прыйшлі, поўныя надзей. Прыйшлі, каб убачыць, даведацца, пазнаёміцца.

Яны — гэта старшакласнікі мінскіх школ, якія займаюцца ў школе юнага карэспандэнта.

Школа юнкораў створана пры факультэце журналістыкі тры гады назад. Сёлета яна зноў аднавіла сваю работу. На першым арганізацыйным пасяджэнні школы перад яе слухачамі выступіў намеснік дэкана журфака І. І. Сачанка, які расказаў аб факультэце. Затым старшакласнікаў запрасілі ў тэле- і радыёстудыю, паказалі кінастужку аб факультэце. Сёлета, як і ў мінулыя гады, пасяджэнне школы юнкораў будзе праходзіць адзін раз у два тыдні. Рабяты будуць слухаць тэарэтычныя лекцыі па журналістыцы, займацца практычна. Добра зарэкамендаваўшыя сябе дзесяцікласнікі пасля заканчэння школы юнкораў атрымаюць пасведчанне, якое будзе прыроўнівацца да творчай характарыстыкі-рэкамендацыі.

**Л. ЯЦЭВІЧ,**
**дырэктар школы юнкораў,**
**студэнтка журфака.**

РОЗДУМ ПАСЛЯ СПЕКТАКЛЯ

# БАЧЫЦЬ ПРОМНІ БУДУЧАГА

...А. Валодзін. Усім добра вядомы гэты аўтар. Крытыкі нават ужо замусолілі штамп аб яго мяккіх, «акварэльных» танах і паўтанах. І вось «Дзве стралы» — дагістарычная прытча-дэтэктыў у каменным стагоддзі. Не якая-небудзь ілюстрацыя да падручніка гісторыі старажытнасці, а п'еса незвычайна моцная па публіцыстычнай сіле свайго папярэджання.

П'есу «Дзве стралы» мы ўбачылі ў выкананні народнага тэатра універсітэта. Паставіў яе рэжысёр В. Анісенка, рэжысёр - педагог— Д. Тыцюк, кампазітар — заслужаны дзеяч мастацтваў БССР С. Картэс. Першая работа новага творчага калектыву.

Перш за ўсё, трэба адзначыць безумоўны поспех тэатра. Сведчанне гэтаму — жывы інтарэс да спектакля і поўная зала на кожным прадстаўленні. Падкупляе шчырасць, энтузіязм самадзейных акцёраў, іх сталая вера ў неабходнасці задуманай справы. І яшчэ тое, што тэатр свой, студэнцкі. Менавіта ў гэтым, апошнім, і трэба шукаць вытокі поспеху. У гэтым — і ў самаадданай працы над матэрыялам п'есы.

...Глава роду занепакоены. Нешта здарылася з людзьмі. Не, яны па-ранейшаму ходзяць на паляванне, па-ранейшаму ціснуцца адзін да аднаго ля вогнішча ў непагадзь, па-ранейшаму бяздумна скачуць у вольны час. Яны зачараваны прамовамі Аратара, любяць Хадака, пабойваюцца Военачальніка, шануюць і слухаюцца яго, Главу роду. Але...

Усё пачалося з забойства Дліннага. Дзве стралы — знак Скарпіёнаў, а самі стрэлы — Вушастага. Хто ж забойца? Думай, думай, Глава. Шмат чаго ты пабачыў у сваім жыцці, і гэты вопыт падказвае табе, што тут нешта незвычайнае. Але ты не здзіўляешся, бо цябе ўжо нішто не здзіўляе...

Эх, Вушасты, Вушасты! Чаму б табе не быць, як усе. Са звычайнымі вушамі, стрэламі, каханнем. Быў бы, як усе, не замінаў бы тым, у каго вушы яшчэ даўжэйшыя за тваіх, — але ў душы.

...Вось цябе і знішчылі, Вушасты. Забілі і твайго сябра Даўганосіка, бо ён перастаў быць «маленькім чалавекам». Пайду і я. Доўгі час я вёў вас, але па гэтай дарозе вы пайшлі самастойна. Добра, ідзіце. Цяпер у вас усё будзе па-іншаму: воіны будуць сядзець ля асобных вогнішчаў і атрымліваць лепшыя кавалкі мяса, Военачальнік будзе купацца ў моры крыві, слова Аратара будзе прыводзіць у экстаз мільёны безгаловых, а на Хадака пральецца сонечнае цяпло жаночай пяшчоты. А я пайду, бывайце...

І ён пайшоў на святло будучага, стомлена ўсміхаючыся. Бо людзей ніколі не пакідае вера у будучыню. Толькі трэба заўсёды бачыць яго промні. Светлы акорд...

Дзеянне спектакля так ці інакш праходзіць праз Главу роду. Сваю ролю Р. Кветнер (яна, дарэчы, найбольш удалая) вядзе так, што мы ні на хвіліну не сумняваемся: перад намі сапраўдны мудрасць, розум і вопыт племя. Ён першы зразумеў — тое, што ў племені адбываецца,—горш за вайну са Скарпіёнамі, і гэта непадуладна яго аўтарытэту. Вось чаму рашэнне пайсці ад сародзічаў успрымаецца не як трусасць ці слабасць, але як мудрасць. Стомленая, але мудрасць.

Сярод жаночых вобразаў вартыя ўвагі ролі Дзяўчыны (В. Дзямідава) і Удавы (А. Зайцава). Для В. Дзямідавай характэрны чысты парыў, узнёсласць, асабліва ў сцэне, дзе яе гераіня гнеўна, нават істэрычна выкрывае ворагаў Вушастага. У вобразе Удавы ў выкананні А. Зайцавай вельмі ўдала спалучаецца жанчына, якой да камізму хочацца замуж (яна нават прыніжаецца дзеля гэтага) і жанчына з балючым смуткам у сэрцы.

Наогул на працягу спектакля добра адчуваецца рэжысёрская работа. Тэатру пашанцавала, што на самым пачатку свайго існавання ён сустрэўся з прафесійным майстрам. Усе згодзяцца, што звычайнага ў такіх выпадках налёту «самадзейнасці» ў спектаклі «Дзве стралы» няма, ён зняты ўмелай рукой рэжысёра.

В. Анісенка прымусіў дзейнічаць на сцэне усіх, нават тых, чыё прозвішча ў праграме значыцца ў масоўцы. Рэжысёр, відаць, вывучыў кожнага са сваіх акцёраў і здолеў злавіць тыя моманты, калі асабістыя рысы характару, знешнасці ўдала спалучаюцца з вобразамі п'есы.

...Ну вось, здаецца, і ўсё. Засталося толькі пажадаць тэатру поспеху, як гэта звычайна робіцца на абмеркаваннях. Але ці гэтага чакае ад нас НАШ тэатр? Так можа рабіць раўнадушны глядач, якому ўсё роўна, якім будзе тэатр праз год, праз два. А паколькі такога гледача пакуль што няма, трэба выказаць некалькі, на наш погляд, істотных заўваг.

ЗАЎВАГА ПЕРШАЯ. Прыгледзімся да вобраза Аратара. Краснабай, крывадушнік, рвецца да ўлады. І хто ведае, мабыць ён яе атрымае. Бо Военачальнік — фігура часовая. Аратар мае грозную зброю — свой язык, ён разумны і хітры.

Гэта ў п'есе. А ў спектаклі Аратар, ролю якога выконвае В. Каратай, атрымаўся звычайным фігляром, словаплётам, які не мае вагі. Яго фіглярства нічым не апраўдваецца. Гэта маска ні на хвіліну не спадае, хаця ёсць моманты, калі гэта неабходна рабіць. Трэба на нейкі час распрануць свайго героя, паказаць яго сапраўдны драпежны твар.

ЗАЎВАГА ДРУГАЯ. Хто такі Хадок? Красаўчык, шчаслівчык, уладар над жанчынамі. А ў выкананні У. Граўцова гэты вобраз не пераканаўчы.

ЗАЎВАГА ТРЭЦЯЯ. І апошняя. Яна датычыць «праграмы тэатра». Спектакль «Дзве стралы» ідзе кожную суботу. Добра, пакуль ёсць энтузіязм, пакуль ёсць рэзервы — розныя выканаўцы. Але трэба быць крышачку дыялектыкам, каб зразумець, што энтузіязм— з'ява часовая. Ён знікае, і яго месца займае звычайны халодны штамп. Гэта ўжо заўважаецца ў С. Мацкевіча, які іграе ролю Военачальніка.

Дзе выйсце? Безумоўна— у новай рабоце.

Мы не ставім мэтай даваць тэатру якія-небудзь рэцэпты. Відаць, калектыў ужо мае пэўныя задумы. Мы толькі хочам засцерагчы яго ад расчараванасці, якая прыходзіць ад таптання на адным месцы...

А цяпер, урэшце, павіншуем народны тэатр з прэм'ерай. Спадзёмся, што хутка пазнаёмімся з яго новымі работамі. Бо ў тэатра ёсць будучыня.

АНДРЭЙ ГАНЧАРОЎ.

СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ У ПРАФСАЮЗАХ

# ПАДВОДЗЯЧЫ ВЫНІКІ

СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЯ КАМПАНІЯ ў прафсаюзнай арганізацыі універсітэта — адказная пара. Аналіз справаздачна-выбарных канферэнцый факультэтаў паказаў, што, дзе актыўна вядзецца прафсаюзная работа, там на належным узроўні прайшлі і канферэнцыі. Хацелася б адзначыць у гэтым плане мехмат, біялагічны факультэт. Тут справаздачы і выбары прайшлі ў адпаведнасці з інструкцыямі аб правядзенні выбараў прафсаюзных органаў. Залы, дзе праводзіліся канферэнцыі, былі прыгожа аформлены, стваралі ўрачыстасць падзеі. Наглядная агітацыя адлюстроўвала жыццё факультэта за справаздачны год. Аднак патрэбна заўважыць, што на некаторых факультэтах дапускаліся парушэнні інструкцыі. На факультэце журналістыкі загадзя падрыхтавалі бюлетэні для тайнага галасавання, а на хіміфаку хацелі правесці канферэнцыю не маючы кворума. І толькі пасля напаміну намесніка старшыні прафкома В. А. Бяляева знайшлі адсутнічаючых дэлегатаў.

У выступленнях дэлегатаў канферэнцый мала ўдзялялася ўвагі пытанням вучобы, навукова-даследчай работы. Асабліва гэта датычыцца фізічнага факультэта і факультэта радыёфізікі і электронікі, што тлумачыцца ў першую чаргу тым, што тут канферэнцыі праводзіліся ў спешцы. У прафком не былі прадстаўлены своечасова спісы кандыдатаў па выбарах ў прафбюро факультэтаў, за выключэннем біялагічнага факультэта і гістфака. У асобных выпадках старшыні прафбюро заканчвалі пісаць даклад за некалькі гадзін да пачатку канферэнцыі. Таму пастановы насілі агульны характар.

**А. КІШКЕВІЧ,**
**намеснік старшыні прафкома па арганізацыйна-масавай рабоце.**



Тайга... Фотаэцюд М. Дубовіка.

СЛУЖБА НЯБАЧНАЯ — СЛУЖБА ВАЖНАЯ

# КЛОПАТЫ АДКАЗНЫЯ

УСЕ ДОБРА ВЕДАЮЦЬ, што такое дэканат, паліклініка, сталовая, друкарня. Але не кожны адразу адкажа, чым займаецца ва універсітэце аддзел забеспячэння. Між іншым, служба гэта вельмі важная, і сустракаемся мы з ёю штодзённа.

— Наш аддзел пастаўляе на факультэты, кафедры і ў лабараторыі ўсё неабходнае абсталяванне для заняткаў, навуковай працы, — тлумачыць загадчык аддзела Уладзімір Іванавіч Тарасевіч.

Аддзел забеспячэння рыхтуе таксама для летняй практыкі вучэбныя базы геаграфічнага і біялагічнага факультэтаў. А ў гэтым годзе клопатаў было ўдвая больш, чым заўсёды: у сувязі з Алімпіядай праводзіўся капітальны рамонт інтэрнатаў, трох сталовых. А зараз будуецца студэнцкае кафэ.

Ёсць, безумоўна, у рабоце службы забеспячэння пэўныя цяжкасці. Яны звязаны ў першую чаргу з тым, што не ўсе факультэты і кафедры своечасова падаюць заяўкі на неабходнае абсталяванне. У выніку гэтага затрачваецца шмат дадатковага часу і энергіі.

Па-другое, у вельмі дрэнным становішчы знаходзяцца складскія памяшканні. У іх вельмі нязручна захоўваць неабходныя рэчы. А, напрыклад, будаўнічыя матэрыялы не маюць нават і такога прыстанішча.

— Калектыў?.. Калектыў добры, — працягвае размову Уладзімір Іванавіч. — Людзі — адданыя працы.

А вось што сказаў аб сваёй рабоце старшы тэхнік аддзела Аляксей Яфімавіч Аўчароў:

— Круглы год — гарачая пара. Рэдка калі спакойна праходзіць дзень — увесь час паездкі, сустрэчы. А паламаныя крэслы, разбітыя шыбы, ракавіны, размаляваныя мудрагелістымі малюнкамі сталы? Гэта таксама наш клопат, клопат забеспячэнцаў.

Дык будзем жа з пашанай адносіцца да гэтай складанай і нябачнай на першы погляд, але вельмі важнай працы!

**В. МАРОЗ,**
**А. ЖОЛУДЗЬ,**
**студэнткі журфака.**

# НА ПАСЯДЖЭННІ БЮРО

камітэта камсамола універсітэта абмеркаваны і зацверджаны новы састаў штаба працоўных спраў. У яго ўвайшлі: Аляксандр Шыбут, намеснік сакратара камітэта камсамола — начальнік ШПС; Аляксандр Рухля, малодшы навуковы супрацоўнік НДІ ФХП — камандзір зводнага атрада; Генадзь Максімаў, студэнт юрфака — камісар воднага атрада; Аляксандр Астапенка, студэнт юрфака — галоўны інжынер; Людміла Янкоўская, студэнтка біяфака — галоўны ўрач.

**В. ГАЛІНСКІ,**
**студэнт журфака.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
27 лістапада 1980 г.
Заказ 1767. АТ 19528

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.
ТЭЛЕФОН 22-07-19

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ